

# КОНСУЛЬТАЦИИ

**М.В. КУЗНЯЦОЎ**

## *ТРАНСФАРМАЦЫЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА НОВЫМ ЭТАПЕ РАЗВІЦЦЯ*

Як бачна з нашага жыцця, трансфармацыя грамадства суправаджаецца шматлікімі выдаткамі. Радужныя спадзяванні людзей на перамены да лепшага азмрочаны новымі складанасцямі і праявамі. Свае пэўныя надзеі яны звязвалі і з новымі сацыяльна-актыўнымі сіламі, што прыйшлі на змену адзінаўладнай на працягу больш чым паўстагодзя партыі. Так мроілася людзям, што новыя палітычныя інсургенты, распяўшы на крыжы сваю канстуцыйную папярэніцу, пойдуць іншым шляхам і, дзейнічаючы ў больш дэмакратычным полі, выправяць яе памылкі, дадуць нарэшце люду жыццё, якога ён прагне. Памкненні людзей мелі ўсе падставы, каб спраўдзіцца. Замест адной партыі ў рэспубліцы ўтварыўся шырокі спектр палітычных партый, якія, здавалася, увасобяць усе грамадскія ўскіраванасці, сацыяльныя чаканні і патрэбы. На пачатку 90-х гадоў партыі ўтвараліся з такой хуткасцю, што гэтую акалічнасць можна было параўнаць хіба што з веснавою паводкай, яе нястрымнасцю і імклівасцю. Гэтаму спрыяла і падтрымка дзяржавы. Дастаткова было сабраць сотню аднадумцаў, заявіць пра сябе на агульным сходзе і... есть партыя. Так "нарадзілася" Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі, Беларуская сялянская партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада і іншыя. Раслі нібыта грыбы пасля дажджу. Вось ужо дзесяць, пятнаццаць, дваццаць... Кожная са сваей праграмай, статутам, сацыяльнай базай і малой колькасцю прыхільнікаў: сто, дзвесці, крыху болей... Мелі паводзе дэмакратычных усталяванняў у грамадстве права і удзельнічалі ў выбранні заканадаўчага органа дзяржавы, прэзідэнта і ў рэферэндуме.

Імклівы рост партый, малаколькасны іх састаў, неакрэсленасць праграмных ускіраванняў, слабая сацыяльная база, спробы выйскі за абмежаванні прававога поля і іншыя праблемы існавання і дзейнасці запатрабавалі ад дзяржавы ўдасканалення заканадаўства аб партыях. Прыняты закон павялічваў колькасць прыхільнікаў, жадаючых стварыць партыю, да пяцісот, абавязваў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь правесці перарэгістрацыю партый. Асаблівых абмежаванняў закон не ўтрымліваў, адкрываў

---

*Мікалай Васільевіч КУЗНЯЦОЎ, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры паліталогіі БДЭУ*

шырокую дарогу грамадзянам выказаць свае намеры, аб'ядначца ў палітычныя арганізацыі. У выніку ў Рэспубліцы Беларусь утварылася 35 палітычных партый. Увайшоўшыя ў іх грамадзяне на падставе дэмакратычных усталяванняў набылі магчымасць выяўляць свае вольныя меркаванні па пытаннях эканамічнай, сацыяльнай, грамадскай палітыкі дзяржавы. Асобныя партыі адразу ж памкнуліся выкарыстаць такую мажлівасць, на падставе закона аб выбарах уключыліся ў прадвыбарчы марафон, марачы ўзыйсці на алімп улады. Не вытрымала гэтага ўладнага свербу і грамадска-палітычнае аб'яднанне Беларускі народны фронт. БНФ першым распачаў барацьбу з КПСС – КПБ і існаваўшай палітычнай сістэмай і перамог у ей. Дзейнічаючы шырокім народным фронтам, гэта нефармальнае аб'яднанне шмат зрабіла па раскрыццю заган тагачасных уладавых структур па скіраванню ўвагі грамадзян Беларусі да вырашэння этна-нацыянальных праблем, вяртанню нацыі да яе спрадвечных каранеў, напоўзабытых лепшых духоўных традыцый. Патрыятычны ўздым нацыі, узначальваемы і накіроўваемы БНФ, стаў новай з'явай у грамадскім, палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь, які, мусіць, можна параўнаць з гістарычным працэсам "беларусізацыі" 20-х гадоў, калі нацыя абудзілася ад сну, усвядоміла сябе адзіным народам, грамадзянамі, якім не сорамна людзьмі звацца. Спрыялаўдумлівая нацыянальная палітыка савецкай улады, якая дапамагла тады ў кароткі час усталявацца, прыжыцца нацыянальным парасткам бадай што ва ўсіх галінах жыццядзейнасці маладой рэспублікі. На жаль, працэс уладкавання беларускага нацыянальнага дома быў прымусова і жорстка перарваны.

У гістарычных умовах нашага часу БНФ меў перспектыву прадоўжыць пачатае ў 20-е гады, зрабіць новы крок да ўмацавання нацыянальнай адметнасці. І пэўнае было здзейснена: рэспубліка прыняла новую канстытуцыю, абвясціла першынство чалавека перад дзяржавай, дала свабоду іншамыснасці, паклаўшы пачатак рэфармаванню палітычнай сістэмы, праявам рынкавай эканомікі, стварэнню прававой дзяржавы, фармаванню грамадзянскага супольніцтва ці, як яго яшчэ называюць, цывільнаму грамадству. Усе адзначанае – немалыя дасягненні маладога апантанага гарачым жаданнем паслужыць Айчыне, нефармальнага грамадска-палітычнага руху БНФ. Мне здаецца, працяг гэтай надзвычай важнай справы ў якасці ўплывовага руху аздобіўся б яшчэ больш значнымі зрухамі рэспублікі. Але БНФ не вытрымаў спакусу ператварыцца як мага хутчэй у партыю, авалодаць на выбарах палітычнай уладай, не адкладваючы здзейсніць свае мэты і задачы. Здавалася, гэта будзе ажыццявіць не складана, асабліва абапіраючыся на іншыя партыі, якія дзейнічалі ў русле ідэй БНФ і адрозніваліся ад яго толькі назвамі і некаторымі праграмнымі накіраванасцямі. Нясцерпны "сверб", што апанаваў найбольш нецярплівых з функцыянераў БНФ, паклаў пачатак асобнай партыі – Партыі Беларускага народнага фронту. Уключыўшыся ў палітычную барацьбу за ўладу ў заканадаўчым органе, за авалоданне інстытутам прэзідэнцтва, БНФ паступова адыйшоў ад сваіх "адраджэнцкіх" імператываў, у запале барацьбы згубіў частку сваіх нядаўніх паплечнікаў. Гэтаму спрыялі такія "дзіцячыя хваробы" БНФ, як апантаная непрыязь да расійскага імперыялізму, непрыманне іншамыснасці, ігнараванне кампрамісаў і іншых набыткаў цывілізаванага саперніцтва ў барацьбе за ўладу і ўплыў у грамадстве.

У выніку БНФ згубіў апірышча ў грамадстве, паставіў сябе ў становішча бескампраміснай апазіцыі да ўлады, а прызнаны ў шэрагах партыі лідэр З.С. Пазняк вымушаны быў нелегальным шляхам перабрацца ў эміграцыю. Адраджэнцкі рух на Беларусі зноў быў спынены, на гэты раз не без бяздумнай, недастаткова асэнсаванай палітыкі партыі БНФ. Таму БНФ нараўне з пэўнымі адметнымі заслугамі перад бацькаўшчынай нясе таксама і груз палітычнай адказнасці за грубыя пралікі ў дзяржаўнай, нацыянальнай

палітыцы сваёй партыі, за ратыфікаванне Вярхоўным Саветам, дзе БНФ на той час меў вялікі ўплыў, віскулёўскіх пагадненняў па развалу СССР, падпісаных стаўленікам аб'яднання С. Шушкевічам. Сёння партыя БНФ, яе лідэры асэнсоўваюць заганы палітычный нецярплівасці і нястрымнага жадання неадкладнага, рэвалюцыйнага пераўтварэння складанасцей жыцця, замест карпатлівай, настойлівай паўсядзённай работы ў грамадстве. Партыя спатыкнулася на тых самых памылках, якія былі ўласцівы КПСС, якія БНФ бачыў, выкрываў, але сам пераадолець не змог. Канфрантацыя з іншамыснымі партыямі і ўладнымі структурамі, адсутнасць тонкасці, талерантнасці ў правядзенні сваей лініі, грубая русафобія і імкненне ўкараніць яе ў свядомасць грамадзян у выніку прывялі БНФ да ізаляцыі ад народа, які не падтрымаў партыю ні на выбарах дэпутатаў у парламент, ні на выбарах прэзідэнта краіны. Каб хоць-неяк захаваць сваю годнасць, лідэры БНФ паспрабавалі вярнуць страчаны імідж, вывелі на вуліцу "зялёную моладзь", аднак рэальнага капіталу ў выніку не набылі. Гэта яшчэ раз гаворыць пра памылковасць і недарэчную паспешлівасць со стварэннем партыі БНФ У рэчышчы грамадска-палітычнага руху, што яднаў шырокія сацыяльныя слаі грамадства, БНФ безумоўна дасягнуў бы большага.

Апынуўшыся ў выгнанні, лідэр БНФ З.С. Пазняк сёння больш слушна ставіцца да сваіх палітычных апанентаў з іншых партый, больш уважана асэнсоўвае інстытут прэзідэнцтва, за авалоданне якога змагаўся на выбарах, бачыць, што дасягнуць важкіх здабыткаў у вырашэнні сацыяльных, эканамічных, нацыянальных праблем краіны можна агульнымі намаганнямі ўсіх дэмакратычных сіл. Цвярозы погляд на рэчаіснасць, змяненне іміджу радыкальнага, апантанага змагара ў сугучнасці з нявыражанымі нацыянальнымі праблемамі, так бы мовіць, "няспетасць" беларускай нацыянальнай песні і іншыя сацыяльныя праявы могуць зноў выклікаць да актыўнага палітычнага жыцця гэтага смелага, адданага сваей ідэі валявога палітыка. Але нерагляд сваей тактыкі, сваіх падыходаў да складаных праблем рэспублікі павінен быць адметным, адчувальным.

Здолее гэта зрабіць Зенон Станіслававіч, значыць, зможа атрымаць зноў давер грамадзян і магчымасць аднаўлення палітычнай дзейнасці. Тады вяртанне будзе суправаджацца і адпаведным вітаннем.

Знайшлі свае сацыяльныя нішы і іншыя партыі. Адны імкнуліся рэалізаваць свае намкненні па адраджэнню нацыянальнай самасвядомасці, другія — рэфармаваць эканоміку ва ўмовах незалежнасці і суверэнітэту дзяржавы, трэція — кіруючыся пачуццем адказнасці за сацыяльную неабароненасць грамадзян перад небяспекай беспрацоўя і галечы.

Нельга пераменшваць і жадання рэалізаваць свае асабістыя амбіцыі, неажыццеўленыя ў іншых сферах сацыяльнай жыццядзейнасці. Не апошнюю ролю пры стварэнні асобных партый адыгрывала і хваравітая гіпербалізацыя такіх асабістых якасцей, як эгаізм, самалюбаванне і самаўпэўненасць. Безумоўна, стварэнню партыі садзейнічала тое, што ў іх сацыяльнаактыўныя сілы бачылі прыступку да ўлады пры вылучэнні сваіх кандыдатур у парламент рэспублікі. Асабісты інтарэс, вядома, павінен быць, бо гэта, можа, самы рухаючы элемент дзейнасці, але ж і грамадскія патрэбы не варта адсоўваць на другарадны план. У нас жа пераважвае першае. У гэтым пераконвае аналіз. Партыі прадстаўляюць вельмі вузкі асяродак грамадства. Пэўны час існавалі асобна Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі (АДПБ) і Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі. Задумваешся, можа, АДПБ памылкова абыйшла нацыянальныя пытанні ў сваей праграме і тым самым паспрыяла "нараджэнню" новай партыі? Не, у гэтым плане ў іх шмат агульнага. А партыі розныя.

Ці ўзяць Аграрную партыю і Беларускую сялянскую партыю. Абедзве пішуць у праграмах, што створаны для вырашэння праблем усе тых жа прадстаўнікоў вёскі. Дзейнічаюць жа паасобку.

Яшчэ больш прыхільнікаў аховы прыроды: Партыя "зялёных" Беларусі, Беларуская экалагічная партыя, Беларуская партыя "Зялены свет". Пачуем такое і паспачуваем прыродзе, што лідэры партыі па сённяшні дзень не зразумелі, што прыроду трэба берагчы, ратаваць усебеларускай талакой, агульнымі намаганнямі.

Усім, хто адданы ў працы, цікава будзе даведацца, што яны не засталіся без палітычнага апірышча. Іх правы бяруцца абараняць Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці і Беларуская партыя працы.

Есць каму ўсталёўваць у грамадстве і справядлівасць. Гэта беларуская партыя "За сацыяльную справядлівасць" і Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці.

Нарэшце ўсцешуцца хрысціяне. Іх душы супакояць Беларуская хрысціянска-дэмакратычная партыя, партыя "Хрысціянска-дэмакратычны выбар" і Беларускі хрысціянска-дэмакратычны саюз.

Могуць таксама спакойна жыць і працаваць прыхільнікі рэспубліканскага ладу ў нашай дзяржаве. Манархія ў нас не пройдзе, бо пра гэта паклапаціліся Рэспубліканская партыя і Беларуская рэспубліканская партыя.

Сацыяльна актыўныя сілы клапоцяцца і пра спорт, яны ствараюць Беларускую сацыяльна-спартыўную партыю і Беларускую аб'яднаную спартыўную партыю. Ёсць дзве партыі — прыхільніцы камуністычных ідэалаў: Партыя камуністаў Беларусі і Камуністычная партыя Беларусі. Як бачыце, барацьбітоў за народнае шчасце ў нас даволі. Партый шмат. Што ні партыя — свае ідэйныя, эканамічныя, сацыяльныя накірункі. Адно слова — вір, калатня. А каб гэтая калатня не ператварылася ў добрую валтузню, стварылі Партыю народнай згоды, хоць да ўтварэння партыі ў рэспубліцы заўсёды лад быў, не тое, што між партыямі. Але пасля, мусіць, зразумелі, што аднае партыі, каб падтрымліваць згоду, мала. Утварылі яшчэ і Партыю ўсебеларускага адзінства і згоды. Быццам Партыя народнай згоды яшчэ некага не аб'яднала. Мне здаецца, Кандрат Крапіва пасмяяўся б разам з намі, каб пачуў гэтыя радкі:

Беларусь пасаг прыдбала:
Божачка ты наш!
Шматпартыйнай раптам стала,
Хоць ты ладзь кірмаш,
І што далей ужо будзе,
Ці асядзе гэта муць?
Хачу крыкнуць на ўсе грудзі:
"Эй, паны, не баламуць!"
Наш народ жыве ў згодзе:
І арэ, і косіць.
Не цалуйце ж яго там,
Дзе ніхто не просіць.

Народ наш пазірае, як размнажаюцца партыі і чэша патыліцу. Ёсць ужо і анекдот: У Івана пытаюцца: "Ці трэба нам столькі партый?" Той адказвае: "Крый божа. Мы ж іх не пракормім". Так, не пракормім, хоць іх колькасцю ўжо перакормлены. Бясспрэчна, сацыяльна актыўныя сілы, грамадзяне могуць, маюць права ствараць партыі, кіруючыся самымі рознабаковымі інтарэсамі і памкненнямі. Найперш, вядома, такія, якія вызначаюць грамадскія праблемы. І гэта, увогуле, не павінна выклікаць незадаволенасці і пярэчанняў. Наша ж крытыка выклікана тымі абставінамі, што, як бачна, некаторыя партыі створаны "пад лідэра", грамадскі інтарэс іх выклікае пытанне. Адным словам, лідэры маюць права ствараць партыі, мы ж маем права на іх крытыку. Беларусі хапіла б і дзвюх партый. Хапае ж іх США, Францыі, Англіі. Нам жа не стае. Сапраўднай, рэ-

альнай шматпартыйнасці ў нас яшчэ няма. Да якіх высноў прыходзім мы ў выніку такога аналізу? Дэмакратыя цудоўная рэч, але ёю трэба ўмець карыстацца. Нам трэба ўсвядоміць, што дзейнасць партыі неабавязкова падпарадкоўваць толькі ідэі заваявання, авалодвання ўладай. Трэба ў прамежкавы час паміж выбарамі працаваць сярод грамадзян, займацца выхаваннем, адукацыяй, павышэннем культурнага ўзроўню, умацоўваючы тым самым свой уплыў, знаёмячы на справе са сваімі праграмнымі мэтамі і задачамі. Разам з грамадствам ствараць прававую дзяржаву, фармуючы і развіваючы грамадзянскую супольнасць. Толькі так можна набыць вядомасць, усталяваць сябе як партыю і тым самым стварыць перадумовы перамогі на выбарах і авалодання ўладай.

Мноства партый для нашай параўнальна невялікай рэспублікі з'ява новая. Яна патрабуе вывучэння, асэнсоўвання. На жаль, на дзяржаўным узроўні ніхто гэтай праблемай не займаецца. Працаваўшае пры Саўміне ў пачатку 90-х гадоў падраздзяленне скарочана. Праблема ж засталася, больш таго, паглыбілася пярэчанні паміж партыямі і ўладнымі структурамі. Прапаноўваемыя партыямі "круглыя сталы" не атрымалі падтрымкі ва ўладах. Праўда, у маі 1997 г. Прэзідэнт краіны А.Р. Лукашэнка склікаў прэс-канферэнцыю з удзелам лідэраў шэрагу партый. Высветлілася, што прэс-канферэнцыя не тая форма кантактаў, якая б задаволіла абодва бакі. Гэта яшчэ і не механізм для пастаяннага ўзаемадзеяння сацыяльна актыўных прадстаўнікоў грамадзян з уладамі ў вырашэнні праблем дзяржавы на адказным гістарычным шляху. Пры ўсіх складанасцях яго трэба знаходзіць. Адной з форм палітычнага дыялогу могуць быць тыя ж "круглыя сталы", сумесныя дыскусіі ў тэлестудыі, артыкулы ў друку, выступленні на радыё, прыем Прэзідэнтам краіны лідэра той ці іншай партыі, запрашэнне прадстаўнікоў партыі на пасяджэнні ўрада, уключэнне іх інтэлектуальнага патэнцыяла пры падрыхтоўцы дакументаў агульнадзяржаўнай значнасці.

Найбольш аптымальную форму ўзаемадзеяння падкажа практыка. Была б праяўлена для гэтага воля бакоў.

Трансфармацыя палітычных партый адбываецца ў нялёгкіх умовах і няпроста.

1. Трансфармацыя арганізацыйная. Партыі аб'ядноўваюцца ў больш буйныя і ўплывовыя агламерацыі. Штуршком да гэтага з'явіўся перадвыбарны марафон у час выбараў у Беларускі парламент і ў час рэферэндуму. Партыі ўсвядомілі, што стаць парламенцкай партыяй, ці партыяй, здольнай стварыць сваю фракцыю ў парламенце, можна толькі згуртаваўшыся, заваяваўшы аўтарытэт сярод суграмадзян. Трансфармацыйныя працэсы закранулі Аб'яднаную дэмакратычную партыю і Грамадзянскую партыю, якія зліліся ў Аб'яднаную грамадзянскую партыю.

2. Трансфармацыя, якая суправаджаецца пераглядам, вызначэннем традыцыйных ідэалагічных парадзігм. Мне здаецца, азначанае асабліва бачна на прыкладзе размежавання прыхільнікаў камуністычнай ідэалогіі. Пэўную трансфармацыю ў поглядах, формах, метадах дзейнасці можна назіраць у БНФ.

3. Трансфармацыя праходзіць нярэдка хваравіта, суправаджаецца ўнутрыпартыйнай дэстабілізацыяй (Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, Партыя народная згоды).

4. Трансфармацыя, палітычная дыфэранцыяцыя палітычных сіл адстаюць ад сацыяльных працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве. Прычынай гэтага з'яўляецца невызначанасць палітычных, сацыяльных арыентацый дзяржавы, накірункаў развіцця грамадства. Пазначаныя ў Канстытуцыі мэты пабудовы прававой дзяржавы, фарміравання грамадзянскай супольнасці не суправаджаюцца рэальнымі зрухамі і пераменамі ў грамадстве. Замаруджванню гэтых працэсаў садзейнічаюць няўпэўненасць грамадзян у правільнасці абранага рэспублікай шляху, нестабільнасць

грамадства, дэфармаванне маральных і духоўных каштоўнасцей. Асабліва гэта бачна на відавочным прыкладзе ўсталявання культу грошай, новых маральных каштоўнасцей. Мараль перастала быць дзейсным стабілізатарам грамадства. Адыйшлі ад гэтых катэгарычных імператываў і верхнія слаі чыноўніцтва, найбольш карумпіраваная частка грамадства. Між тым высокая маральнасць вышэйшых іерархаў улады заўседы была перавагай, вышэйшым аўтарытэтам каралеў, што з'ядноўвала нацыі.

5. На паскарэнні працэсу трансфармацыі палітычных партый адмоўна адбіваецца нізкі ўзровень агульнай і палітычнай культуры грамадства, яго неаднароднасць, сацыяльнае расслаенне, прагматычны рацыяналізм.

6. Дзяржава не выконвае ў адносінах да партый сваіх сацыяльных абавязацельств.

7. Сродкі масавай інфармацыі знаходзяцца пад татальным кантролем дзяржавы, што звужае інфармацыйны прастор, абцяжарвае магчымасці зносін партый і грамадзян. У многім гэта спрыяла адрыву партыі ад грамадзян.

8. Змена і шматзначнасць парадзігм не суправаджаецца ўвагай і падтрымкай дзяржавы.

9. Палітычныя партыі не зацвердзілі сябе як лідэры палітычнай сістэмы і суб'екты палітыкі.

10. Для вывучэння дзейнасці палітычных партый, вызначэння палітычных рэкамендацый па наладжванню ўзаемадзейнасці партый, дзяржавы і ўладных структур лічыў бы мэтазгодным стварыць пры Беларускай асацыяцыі палітычных навук недзяржаўны, непалітызаваны Кансультатыўны савет, падмацаваўшы яго аналітычную работу пэўным фінансаваннем.

11. Погляды, думкі, памкненні палітычных партый, якія выказваюць інтарэсы грамадзян, павінны быць у цэнтры ўвагі дзяржавы. У дэмакратычным грамадстве прыхільнікі розных ідэй маюць права на пратэст, наладжванне дэманстрацый, маршаў, пікеціравання, байкотаў, забастовак і іншых форм грамадзянскай дзейнасці. Пры гэтым вельмі важна ўсведамляць, што толькі адна свабода не гарантуе эканамічнага працвітання і стабільнасці. Рэпрэсіі ж больш унлывова гарантуюць эканамічны правал.

12. Набывае рэальныя рысы працэс вяртання да аўтарытарнага палітычнага рэжыму. Гэта бачна па хістанні ўладных структур і пошуках апірышча ў былой бюракратычнай сістэме, па алігархізацыі існуючых інстытутаў улады. Сведчаннем гэтага з'яўляецца тое, што палітычныя партыі ігнаруюцца, з імі адсутнічае палітычны дыялог. У той жа час адсутнічае, улічваючы колькасць партый, партыйны, палітычны пратэст, супраціўленне гэтаму наступленню.

13. Асобныя партыі створаны пад дзяржаўны, аўтарытарны заказ у абмен на лаяльнасць, матэрыяльную падтрымку і дзяржаўны патэрналізм.

14. Дыферэнцыяцыя палітычных партый пойдзе паскоранымі тэмпамі па меры ўсталявання дэмакратычных інстытутаў рэфармуемай палітычнай сістэмы, калі ўмацуецца іншамыснасць, адыйдуць у нябыт таталітарная і аўтарытарныя сістэмы кантролю пад грамадствам і грамадзянамі.

15. Дыферэнцыяцыі, трансфармацыі палітычных партый могуць садзейнічаць і шэраг дзяржаўных, прававых актаў: перарэгістрацыя, юрыдычнае асэнсаванне выканання партыямі закона аб партыях. Сёння частка партый наогул не дзейнічае: не адкрылі сваіх разліковых рахункаў, не маюць пярвічных арганізацый, месцазнаходжанне іх выканаўчых органаў невядома. Аб'яўлены пры рэгістрацыі колькасны састаў, у сувязі з адсутнасцю дакументальнага ўліку і фіксаванага членства, выклікае недавер.

Трансфармацыя палітычных партый — аб'ектыўны працэс, ён адбываецца пад уплывам дэмакратызацыі інстытутаў грамадства, вырашэння шматлікіх нашых праблем.